Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 1(82), 2014

## Рецензии

УДК 811.161.3'374:821.161.3

# Новая вяршыня беларускай пісьменніцкай лексікаграфіі

В.К. Шчэрбін

Рэц. на: Слоўнік мовы Янкі Купалы. У 8-мі т., 9-ці кн. – Мінск., 1997–2012 (Т. 1: А–Г. – Мінск., 1997. – 340 с.; Т. 2: Д–К. – Мінск, 1999. – 416 с.; Т. 3: Л–П. – Мінск, 2001. – 413 с.; Т. 4: П–С. – Мінск, 2002. – 354 с.; Т. 5: С–Я. – Мінск, 2002. – 398 с.; Т. 6. Анамастыка. – Мінск, 2003. – 262 с.; Т. 7: А–І (дадатак). – Гомель, 2012. – 556 с.; Т. 8, кн. 1: К–Р (дадатак). – Гомель, 2012. – 564 с.; Т. 8, кн. 2: С– Я (дадатак). – Гомель, 2012. – 488 с.).

Рэцэнзуемы «Слоўнік мовы Янкі Купалы” (далей СМЯК) з'яўляецца вельмі ёмістай у паліграфічных адносінах (8 тамоў, 9 кніг) і даволі складанай па сваёй унутранай будове даведачнай працай. З пункту гледжання сучаснай лексікаграфічнай семіётыкі СМЯК яднае ў сабе чатыры самастойныя слоўнікі мовы пісьменніка, кожны з якіх падае рэестравыя адзінкі ад А да Я і мае пэўныя асаблівасці, абумоўленыя тыпам слоўніка (тлумачальным або тлумачальна-энцыклапедычным), характарам апісваемай лексікі (апелятыўнай або анамастычнай) і колам зыходных купалаўскіх крыніц (тэксты з сямітомнага збору твораў Янкі Купалы і тэксты, якія не трапілі ў гэты збор і былі апублікаваны пазней). У прыватнасці, размеркаванне гэтых розных слоўнікаў па тамах СМЯК мае наступны выгляд:

1) першыя пяць тамоў СМЯК складае тлумачальны слоўнік апелятыўнай лексікі (ад А да Я) з сямітомнага Збору твораў Янкі Купалы (Мінск, 1972–1976);

2) шосты тым СМЯК уяўляе сабой самастойны тлумачальна-энцыклапедычны слоўнік анамастычнай і тапанімічнай лексікі з сямітомнага Збору твораў Янкі Купалы;

3) у сёмым томе, першай кнізе і пачатку другой кнігі (С. 3–412) восьмага тома СМЯК у алфавітным парадку (ад А да Я) тлумачыцца апелятыўная лексіка з купалаўскіх літаратурна-мастацкіх і публіцыстычных твораў на беларускай мове, якія ў свой час не трапілі ў ягоны сямітомны збор твораў;

4) канчатак другой кнігі (С. 413–484) восьмага тома СМЯК прысвечаны апісанню ў алфавітным парадку анамастычнай і тапанімічнай лексікі з тых твораў паэта, якія не ўвайшлі ў сямітомны збор твораў.

Тым не менш, нягледзячы на тыпалагічныя, лексічныя, храналагічныя і крыніцазнаўчыя адрозненні, існуючыя паміж пералічанымі вышэй слоўнікамі мовы пісьменніка, яны цалкам абгрунтавана аб'яднаны ў рамках аднаго комплекснага даведачнага выдання (СМЯК), паколькі іх агульным аб'ектам апісання з'яўляецца лексіка купалаўскіх твораў, якая апрацоўвалася адзіным калектывам лексікографаў (выкладчыкаў філалагічнага факультэта ГДУ імя Ф. Скарыны) паводле агульнага плана і на аснове тоесных тэарэтычных прынцыпаў.

Практычная праца па складанні слоўнікавай картатэкі для будучага СМЯК распачалася сіламі кафедры беларускай мовы і лінгвістычнай лабараторыі ГДУ імя Ф. Скарыны ў 1975 г. Спачатку планавалася, што СМЯК будзе складацца з трох тамоў, у якіх будзе апісвацца толькі апелятыўная лексіка з твораў Янкі Купалы [1, с. 88]. Менавіта ў такім выглядзе быў надрукаваны напачатку і «Слоўнік мовы Скарыны» (Мінск, 1977–1984), за які яго аўтар – доктар філалагічных навук, прафесар У.В. Анічэнка – быў удастоены ў 1988 г. звання лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР. Трэці, анамастычны том «Слоўніка мовы

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Скарыны» апублікаваны значна пазней (у 1994 г.), як упершыню ў беларускай лексікаграфіі акадэмічным Інстытутам мовазнаўства быў надрукаваны «Анамастычны слоўнік твораў Якуба Коласа" пад рэд. М.В. Бірылы (1990). Супрацоўнікі якраз гэтай навуковай установы задавалі ў той час тэмп развіццю айчыннай слоўнікавай справы, паколькі менавіта яны першымі выдалі 40 пробных слоўнікавых артыкулаў па апелятыўнай лексіцы з мовы твораў Якуба Коласа [2], «Фразеалагічны слоўнік мовы твораў Якуба Коласа» пад рэд. А.С. Аксамітава (1993) і многія іншыя даведнікі.

На жаль, у апошнія два дзесяцігоддзі гэтая навуковая ўстанова перажывае не самыя лепшыя часы ў сваёй гісторыі. Пра гэта сведчыць не толькі бясконцае яе рэфармаванне і адсутнасць прынцыпова новых акадэмічных даведнікаў, але і публікацыя шматлікіх негатыўных рэцэнзій на чарговыя перавыданні такіх даведнікаў [3–8]. У гэтых умовах ініцыятыва падрыхтоўкі і выдання беларускіх аўтарскіх слоўнікаў (слоўнікаў мовы пісьменніка) паступова перайшла да зладжанага калектыва гомельскіх лексікографаў, які здолеў выканаць і шматкратна перавыканаць свой першапачатковы план. Замест трох запланаваных тамоў тлумачальнага слоўніка купалаўскай апелятыўнай лексікі гомельскімі мовазнаўцамі было выдадзена на працягу 15 гадоў (1997–2012) восем тамоў СМЯК, у дзевяці кнігах.

Гэты выключна станоўчы вынік быў дасягнуты дзякуючы таму, што з самага пачатку працы калектыў складальнікаў СМЯК узначальваў такі дасведчаны і высокапрафесійны лексікограф і гісторык мовы, як У.В. Анічэнка. Комплексны падыход да апісання слоўнікавага складу мовы пісьменнікаў быў выпрацаваны У.В. Анічэнкам яшчэ да пачатку працы над СМЯК, пад час складання ім «Слоўніка мовы Скарыны» [9]. Больш таго, менавіта слоўнікавая апрацоўка скарынаўскіх тэкстаў стала тым творчым палігонам, на якім У.В. Анічэнка ўдасканальваў свае лексікаграфічныя тэхналогіі [10]. На думку рэцэнзента першага тома СМЯК В. Ярца, праца У.В. Анічэнкі над «Слоўнікам мовы Скарыны» шмат у чым «паспрыяла глыбока асэнсаванаму, плённаму падыходу і да «прачытання» купалаўскай літаратурнай спадчыны ў святле выяўлення яе моўных рэсурсаў, у сістэмным вылучэнні незвычайна шчодрых на шматлікія адценні слова і сказа непаўторнага Майстра» [11, с. 301].

Наколькі паспяхова ішла ў Гомельскім дзяржуніверсітэце праца па складанню слоўнікавай картатэкі і пробных артыкулаў для будучага СМЯК, можна меркаваць па таму, што ўжо ў 1982 г. (за 15 гадоў да выхаду з друку першага тома) адбылася першая маштабная публікацыя «Матэрыялаў для слоўніка мовы Янкі Купалы», пробныя артыкулы для якой падрыхтавалі У.В. Анічэнка, У.А. Бобрык, В.А. Кісялёва, С.А. Лін, В.А. Ляшчынская, А.А. Парукаў, З.А. Рудакоўская, А.А. Станкевіч, Л.М. Юрчанка, Л.Р. Якаўлева [1, с. 89]. Менавіта тады вызначыўся і асноўны касцяк аўтараў (У.В. Анічэнка, У.А. Бобрык, В.А. Ляшчынская, А.А. Парукаў, А.А. Станкевіч), якія ўдзельнічалі ў складанні ўсіх васьмі тамоў СМЯК. Апрача згаданых вышэй асноўных аўтараў слоўнікавых артыкулаў (яны па чарзе выступалі і рэдактарамі асобных тамоў), у працы над СМЯК бралі ўдзел і іншыя выкладчыкі і лабаранты кафедры беларускай мовы, супрацоўнікі лінгвістычнай лабараторыі, студэнты-філолагі ГДУ імя Ф. Скарыны: Н.А. Багамольнікава, М.М. Воінаў, У.І. Гаркуша, С.А. Закаўраш, Н.М. Іванешка, В.А. Кісялёва, С.А. Лін, А.Л. Мацюшкіна, Л.М. Мінакова, А.П. Назаранка, В.Н. Рак, З.А. Рудакоўская, Р.В. Серыкаў, В.А. Скачкова, С.М. Струкава, І.В. Шаройкіна, Л.М. Юрчанка, Л.Р. Якаўлева, В.І. Яцухна [12, с. 4–5].

У храналагічных і тыпалагічных адносінах гісторыя выдання СМЯК выразна разбіваецца на тры асобныя этапы:

1) першы этап ахоплівае 1997–2002 гг., на працягу якіх выдадзены першыя пяць тамоў СМЯК. Галоўным вынікам гэтага этапу стала публікацыя тлумачальнага слоўніка апелятыўнай лексікі з сямітомнага Збору твораў Янкі Купалы. Агульны выдавецкі аб'ём гэтага слоўніка складае 1921 кніжную старонку. У сваю чаргу, агульны лексікаграфічны аб'ём гэтай часткі СМЯК, прысвечанай апісанню апелятыўнай лексікі купалаўскіх твораў, складае 20384 слоўнікавыя артыкулы трох тыпаў (самастойнага, адсылачнага і параўнальнага). Дарэчы, у пробных артыкулах Слоўніка мовы Якуба Коласа «адрозніваюцца два тыпы слоўнікавых артыкулаў: самастойныя і адсылачныя» [2, с. 4];

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

2) другі этап (2003–2011 гг.) яднае наступныя слоўнікавыя працы: а) шосты том СМЯК, у якім змешчаны тлумачальна-энцыклапедычны слоўнік анамастычнай і тапанімічнай лексікі з сямітомнага Збору твораў Янкі Купалы. Кніжны аб’ём гэтай часткі СМЯК складае 262 старонкі, а рэестравы аб’ём – 1497 слоўнікавых артыкулаў; б) шэраг аспектных аўтарскіх слоўнікаў, якія створаны на матэрыяле слоўнікавай картатэкі купалаўскай моватворчасці асобнымі лексікографамі (В.А. Ляшчынскай, З.У. Шведавай) у ініцыятыўным парадку, а таму не ўключаны ў агульны склад СМЯК: «Матэрыялы да слоўніка метафар паэзіі Янкі Купалы”, якія дадаюцца да манаграфіі В.А. Ляшчынскай «Метафара ў паэзіі Янкі Купалы” (Гомель, 2003. – с. 81–158); «Слоўнік параўнанняў у мове мастацкіх твораў Янкі Купалы» В.А. Ляшчынскай, З.У. Шведавай (Гомель, 2004. – 104 с.); «Слоўнік фразеалагізмаў мовы твораў Янкі Купалы» В.А. Ляшчынскай і З.У. Шведавай (Гомель, 2007. – 312 с.) і інш.;

3) трэці этап (2012 г.) уключае наступныя слоўнікавыя працы: а) сёмы том, першую кнігу і пачатак другой кнігі (С. 3–412) восьмага тома СМЯК, у якіх змешчаны тлумачальны слоўнік апелятыўнай лексікі з купалаўскіх літаратурна-мастацкіх і публіцыстычных твораў на беларускай мове, якія ў свой час не трапілі ў сямітомны збор твораў паэта. Агульны кніжны аб’ём гэтага аўтарскага слоўніка складае 1532 старонкі, а рэестравы аб’ём – 9389 слоўнікавых артыкулаў; б) канчатак другой кнігі (С. 413–484) восьмага тома СМЯК, у якім пададзены тлумачальна-энцыклапедычны слоўнік анамастычнай і тапанімічнай лексікі пад агульнай назвай “Анамастыка”, куды трапілі разнастайныя онімы з купалаўскіх літаратурна-мастацкіх і публіцыстычных твораў на беларускай мове, што ў свой час не ўвайшлі ў сямітомны збор твораў паэта. Рэестравы аб’ём гэтага самастойнага анамастычнага слоўнічка складае 550 слоўнікавых артыкулаў. Выкананне гэтага не запланаванага раней этапа стала пільна неабходным з наступнай нагоды: у постсавецкі час было выдадзена шмат таго з рукапіснай спадчыны Янкі Купалы, што раней ніколі не планавалася да выдання.

Такім чынам, калі чыста механічна аб’яднаць рэестравы матэрыял усіх чатырох аўтарскіх слоўнікаў, што ўвайшлі ў склад СМЯК, то яго агульны аб’ём, па нашых падліках, складзе 31817 слоўнікавых артыкулаў. Пры гэтым, аднак, трэба ўсведамляць тую акалічнасць, што значная колькасць рэестравых апелятываў паўтараецца ў тлумачальных аўтарскіх слоўніках (тт. 1–5 і тт. 7–8), складзеных на матэрыяле сямітомнага Збору твораў Янкі Купалы, з аднаго боку, і на матэрыяле больш позніх яго выданняў, з другога. Таксама часткова паўтараецца рэестравая лексіка ў анамастычных слоўніках мовы паэта (2003 і 2012 г. выдання). Таму даведацца аб дакладнай колькасці рэестравых адзінак у купалаўскім лексіконе, на наш погляд, стане магчымым толькі ў тым выпадку, калі ў дадатак да існуючых дзевяці кніг СМЯК будзе выдадзена яшчэ і дзесятая кніга – зводны паказальнік рэестравай (апелятыўнай і анамастычнай) лексікі СМЯК, які дазволіць аб’яднаць у агульным алфавітным парадку рэестравыя багацці ўсіх чатырох аўтарскіх слоўнікаў, што ўваходзяць у яго склад. Пакуль жа адназначна можна сцвярджаць толькі адно: рэестравы аб’ём купалаўскага лексікона істотна перавышае лічбу ў 25 тысяч лексічных адзінак, але назваць больш дакладную лічбу да з’яўлення зводнага паказальніка СМЯК немагчыма.

Апрача ўсяго іншага, складанне зводнага паказальніка дапаможа істотна ўдакладніць частотныя характарыстыкі рэестравых адзінак СМЯК, якія ў выніку іх сумавання для шырокаўжывальных слоў даволі істотна могуць змяніцца. Для прыкладу, калі меркаваць адносна частотнасці слова *вучоны* ў першым томе СМЯК (яно мае індэкс частотнасці, роўны 15), то гэта слова не адносіцца да ліку ключавых слоў паэта, г.зн. такіх слоў, якія маюць індэкс частотнасці вышэй за 50. Аднак, калі мы зазірнем у 7 том СМЯК, то там гэта слова будзе мець зусім іншы індэкс частотнасці (99). У сукупнасці (15+99) зводны індэкс частотнасці для слова *вучоны* на матэрыяле ўсіх тамоў СМЯК складзе лічбу 114. А гэта ўжо дае падставы разглядаць указанае слова ў якасці аднаго з ключавых слоў паэта, прычым дазваляе рабіць гэта з вялікім запасам.

Аналагічныя прыклады можна прывесці і на матэрыяле анамастычных слоўнікаў, што ўваходзяць у склад рэцэнзуемага намі комплекснага даведніка (часам лексікографы называюць такія комплексныя даведнікі слоўнікавымі камбайнамі). Так, калі прасумаваць

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

індэксы частотнасці онімаў *Беларусь* (168+107) і *Мінск / Менск* (56+53) з шостага тома і другой кнігі восьмага тома СМЯК, то зводныя індэксы частотнасці гэтых онімаў (275 і 109) істотна перавысяць той узровень частотнасці, які дазваляе лічыць іх ключавымі словамі паэта. Інакш кажучы, ёсць усе падставы раглядаць гэтыя онімы ў якасці ядзерных аўтарскіх канцэптаў.

Адзначаная вышэй колькасная няпэўнасць з рэестравым аб’ёмам СМЯК, тым не менш, не перашкаджае нам ацаніць рэцэнзуемую працу з якаснага боку, шляхам параўнання СМЯК з лепшымі ўзорамі пісьменніцкай і тлумачальнай лексікаграфіі на постсавецкай прасторы. (Даволі падрабязны агляд дасягненняў сучаснай аўтарскай лексікаграфіі гл. [13–14]). На наш погляд, па свайму рэестраваму аб’ёму, па глыбіні семантызацыі, граматычнай і стылёвай характарыстыцы купалаўскага слова, паслядоўнасці выкарыстання пашпартызаванага ілюстрацыйнага матэрыялу і многіх іншых сваіх параметрах СМЯК даволі істотна наблізіўся да чатырохтомнага «Словаря языка Пушкина” (1956–1961), які па сённяшні дзень застаецца ў рускай лексікаграфіі «самым значным з завершаных пісьменніцкіх слоўнікаў» [15, с. 17]. Больш таго, па свайму рэестраваму аб’ёму СМЯК больш чым у два разы пераўзыходзіць двухтомны «Словник мови Шевченка» (1964), у якім падаецца 10116 загаловачных слоў, і амаль у два разы перавышае аб’ём «Слоўніка мовы Скарыны» (1977–1994), які змяшчае звыш 12,5 тысяч рэестравых адзінак.

І ўжо зусім ніякай канкурэнцыі рэцэнзуемаму намі комплекснаму даведніку не могуць скласці асобныя аспектныя слоўнікі мовы Якуба Коласа, выдадзеныя акадэмічным Інстытутам мовы і літаратуры: «Анамастычны слоўнік твораў Якуба Коласа» (1990), «Фразеалагічны слоўнік мовы твораў Якуба Коласа» (1993), «Тлумачальны слоўнік адметнай лексікі ў творах Якуба Коласа» (2003), «Слоўнік лексічных варыянтаў у мове твораў Якуба Коласа» (2012) і інш. Тлумачыцца гэта тым, што сярод пералічаных вышэй розных аўтарскіх слоўнікаў мовы Якуба Коласа, якія падаюцца іх складальнікамі як «адзіны комплекс прац, прысвечаных лексікаграфічнаму апісанню моўнага багацця творчасці народнага пісьменніка» [16, с. 4], пакуль што адсутнічае ключавая частка гэтага комплексу – поўны тлумачальны слоўнік апелятыўнай лексікі мовы Якуба Коласа. Між тым, падрыхтоўка і выданне пісьменніцкага слоўніка ўказанага тыпу, па сведчанні акадэміка М.В. Бірылы, з’яўляецца значна больш складанай справай, чым стварэнне, напрыклад, анамастычных пісьменніцкіх слоўнікаў: «Так, у слоўніках апелятыўнай лексікі асноўная ўвага аддаецца распрацоўцы значэнняў слова, а ў анамастычных слоўніках гэтая частка слоўнікавага артыкула адсутнічае зусім» [17, с. 3].

Каб праверыць, наколькі якасна распрацаваны значэнні слоў у СМЯК і наколькі паслядоўна яны ілюструюцца прыкладамі з твораў паэта, намі быў праведзены параўнальны аналіз слоўнікавых артыкулаў ключавых слоў (яны маюць індэкс частотнасці вышэй за 50) на літару А у СМЯК і іх поўных лексічных адпаведнікаў у пяцітомным «Тлумачальным

Табліца 1. Параўнальны аналіз слоўнікавых артыкулаў ключавых слоў у «СМЯК» і іх лексічных адпаведнікаў у пяцітомным «ТСБМ»

| | | СМЯК | | ТСБМ | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Колькасць радкоў | Колькасць значэнняў | Колькасць радкоў | Колькасць значэнняў |
| 1. | *Агонь* | 79 | 8 | 83 | 5 |
| 2. | *Аддаць* | 80 | 5 | 125 | 9 |
| 3. | *Адзін* | 295 | 16 | 179 | 9 |
| 4. | *Акно* | 31 | 1 | 22 | 3 |
| 5. | *Апошні* | 83 | 10 | 62 | 7 |
| 6. | *Арол* | 46 | 3 | 18 | 2 |
| | Сярэдняе значэнне | 102 | 7,2 | 81 | 5,8 |

слоўніку беларускай мовы» (ТСБМ). Адбор для параўнання менавіта ключавых слоў з мовы Янкі Купалы (на літару А такіх слоў набралася 6 адзінак) тлумачыцца тым, што для аналізу

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

мовы пісьменніка рэкамендуецца выбіраць «словы асаблівай якасці. Гэта павінны быць словы, важныя для разумення творчасці пісьменніка ў цэлым, яго светапогляду, яго ідэалаў, для тлумачэння мэт, якія ён лічыў галоўнымі ў жыцці чалавека, народа, чалавецтва» [18, с.16]. Пры гэтым у адабраных для аналізу слоўнікавых артыкулах нас цікавілі наступныя два паказчыкі: аб'ём слоўнікавага артыкула (ён вымяраўся колькасцю радкоў у ім) і колькасць вылучаемых у слоўнікавым артыкуле значэнняў слова і яго адценняў. Вынікі праведзенага намі параўнання адлюстраваны ў табліцы 1.

Дадзеныя Табліцы 1 паказваюць, што па сярэдніх значэннях абодвух паказчыкаў СМЯК істотна пераўзыходзіць ТСБМ. Так, у СМЯК сярэдні аб'ём слоўнікавага артыкула для 6 ўказаных ключавых слоў складае 102 радкі, а ў акадэмічным тлумачальным слоўніку ён мае 81 радок. У сваю чаргу, сярэдняя колькасць значэнняў у абследаваных слоўнікавых артыкулах СМЯК налічвае 7,2 значэння, а ў ТСБМ гэты паказчык роўны 5,8 значэння. Інакш кажучы, семантызацыя зместу ключавых слоў у СМЯК ажыццяўляецца больш поўна, чым у ТСБМ, а ілюструюцца яны ў СМЯК прыкладамі з твораў Янкі Купалы больш паслядоўна, чым іх лексічныя адпаведнікі ў ТСБМ. З усіх гэтых параўнанняў можна зрабіць толькі адну выснову: сёння менавіта СМЯК з'яўляецца новая вяршыняй беларускай пісьменніцкай лексікаграфіі.

Можна бясконца разглядаць назапашаныя ў СМЯК моўныя багацці (трапныя дэфініцыі, дакладныя граматычныя і стылёвыя характарыстыкі слоў, іх колькасныя паказчыкі, шматлікія і разнастайныя прыклады з твораў паэта, устойлівыя спалучэнні слоў і фразеалагізмы, амонімы і варыянты). Аднак і таго, што нам ужо ўдалося згадаць у сваёй рэцэнзіі, дастаткова, каб цалкам падтрымаць наступную думку В. Ярца: «З выхадам у свет … «Слоўніка мовы Янкі Купалы" можна сцвярджаць, што ў Гомелі сфарміравалася адметная лінгвістычная школа са сваім канкрэтна-спецыфічным напрамкам, з шырокім абсягам навуковых пошукаў і аналізу моўных нацыянальных скарбаў» [11, с. 304]. Менавіта гэтая гомельская лінгвістычная школа вызначае сёння вышэйшы ўзровень беларускай пісьменніцкай лексікаграфіі. Таму ў нас ёсць усе неабходныя падставы для заключэння аб тым, што калектыў складальнікаў васьмітомнага, у дзевяці кнігах, «Слоўніка мовы Янкі Купалы» заслугоўвае вылучэння яго на атрыманне вышэйшай нацыянальнай навуковай узнагароды – Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі.

## Літаратура


1. Матэрыялы для слоўніка мовы Янкі Купалы // Беларуская мова. Вып. 10. – Мінск, 1982. – с. 88–109.
2. Жывое Коласава слова // Беларуская лінгвістыка. – Вып. 18. – Мінск, 1980. – с. 3–13.
3. Лепешаў, І. Слоўнік добры, але не надта / І. Лепешаў // Наша слова. – 2012. – 6 чэрвеня. – с. 2–3.
4. Лепешаў, І. Яшчэ пра СБМ-12 / І. Лепешаў // Наша слова. – 2012. – 20 чэрвеня. – с. 3.
5. Баршчэўскі, Л. Два слоўнікі і розныя думкі / Л. Баршчэўскі // Наша слова. – 2012. – 26 снежня. – с. 2.
6. Пацюпа, Ю. Дзве галавы добра, а адна лепш…/ Ю. Пацюпа // Дзеяслоў. – 2012. – № 3. – с. 330–333.
7. Лепешаў, І. Пра слоўнік фразеалагізмаў з твораў Якуба Коласа / І. Лепешаў // Роднае слова. – 2013. – № 4. – с. 27–29.
8. Лепешаў, І.Я. Пра акадэмічны слоўнік беларускай мовы (2012) / І. Лепешаў // Слово и словарь = Vocabulum et vocabularium: сборник научных трудов. – Гродно, 2013. – с. 14–18.
9. Анічэнка, У.В. Прынцыпы складання слоўнікаў мовы пісьменнікаў / У.В. Анічэнка // Беларуская мова і літаратура ў ВНУ. Тэзісы дакладаў навукова-метадычнай канферэнцыі. – Брэст, 1971. – с. 182–186.
10. Шчэрбін В.К. «Слоўнік мовы Скарыны» – наватарская з'ява ў беларускай лексікаграфіі / В.К. Шчэрбін // Скарына і наш час: Матэрыялы II Міжнароднай навуковай канферэнцыі. У 2 ч. – Ч. 2. – Гомель, 2002. – с. 93–102.
11. Ярац В. Акіян роднага слова (Слоўнік мовы Янкі Купалы. У васьмі тамах. Т. 1. Мінск, 1997) / В. Ярац // Полымя. – 1998. – № 4. – с. 300–305.


РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

12. Прадмова // Слоўнік мовы Янкі Купалы. У 8 т. – Т. 1 / рэд. У.В. Анічэнка. – Мінск, 1997. – с. 3–5.
13. Шчэрбін В.К. Ад пісьменніцкіх глос – да поўных слоўнікаў мовы пісьменніка / В.К. Шчэрбін // Роднае слова. – 2003. – № 1. – с. 16–21.
14. Шчэрбін В.К. Ад поўных слоўнікаў мовы пісьменніка – да гіпертэкставых і ідэаграфічных слоўнікаў моўнай асобы пісьменніка / В.К. Шчэрбін // Роднае слова. – 2004. – № 2. – с. 42–48.
15. Шестакова Л.Л. «Словарь языка Пушкина» в истории авторской лексикографии // Авторская лексикография и история слов: К 50-летию выхода в свет «Словаря языка Пушкина» / Отв. ред. Л.Л. Шестакова. – М., 2013. – с. 11–18.
16. Прадмова // Слоўнік лексічных варыянтаў у мове твораў Якуба Коласа. – Мінск, 2012. – с. 3–5.
17. Прадмова // Анамастычны слоўнік твораў Якуба Коласа / Пад рэд. М.В. Бірылы. – Мінск, 1990. – с. 3–6.
18. Караулов Ю.Н. Опыт типологизации авторских словарей / Ю.Н. Караулов, Е.Л. Гинзбург // Русская авторская лексикография XIX–XX веков: Антология / Отв. ред. Ю.Н. Караулов. – М., 2003. – с. 4–16.

Центр системного анализа и
стратегических исследований НАН Беларуси

Поступила в редакцию 09.01.2014

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ ФРАНЦИСКА СКОРИНЫ